# ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА Ў 2025 ГОДЗЕ

***Камендантава В.М.,*** *намеснік дырэктара*

*Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна*

Прыярытэтнымі накірункамі работы Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна ў мінулым годзе заставаліся максімальна поўнае забеспячэнне інфармацыйных запытаў карыстальнікаў і інфармацыйная падтрымка сацыякультурных мерапрыемстваў бібліятэкі, далучэнне карыстальнікаў да найлепшых узораў беларускай кніжнай спадчыны, папулярызацыя творчасці дзеячаў беларускай літаратуры, культуры, мастацтва – юбіляраў 2025 года, наладжванне міжнародных сувязей, работа ў міжбібліятэчных карпаратыўных праектах, умацаванне прафесійных кантактаў.

У 2025 годзе аддзеламі бібліятэкі абслужана 31,9 тыс. непасрэдных карыстальнікаў пры плане 31,4 тыс. (101,8 % да плана). Неабходна адзначыць рэзкае павелічэнне колькасці непасрэдных чытачоў-дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў: за мінулы год дадзены паказчык узрос на 45 % і склаў 12,2 тыс. чалавек.

Абанентам бібліятэкі за справаздачны год выдана 583,9 тыс. экз. бібліятэчных дакументаў (106,2 % да запланаванага). З агульнай колькасці выданых дакументаў 182,8 тыс. экз. складае мастацкая літаратура (31,3 %), 56,6 тыс. экз. – выданні на беларускай мове (9,7 %). Карыстальнікам да 18 гадоў выдана 63,1 тыс. экз. дакументаў.

Агульная колькасць наведванняў склала 2241,1 тыс. (119,5 % да плана). У справаздачным годзе колькасць віртуальных наведванняў на афіцыйны сайт бібліятэкі дасягнула 2087,8 тыс., непасрэдных – 153,3 тыс.

Значны рост колькасці віртуальных зваротаў звязаны з высокай запатрабаванасцю рэсурсаў уласнай генерацыі, размешчаных на афіцыйным сайце бібліятэкі. Створаны і пастаянна актуалізуюцца 17 бібліяграфічных, камбінаваных і паўнатэкставых баз даных, у тым ліку краязнаўчай тэматыкі: «Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць», «Афганистан. Без права на забвение», «Художники Витебщины», «Человек года Витебщины» і інш. За мінулы год іх аб’ём павялічыўся на 42,6 тыс. запісаў.

2025 год быў адзначаны стварэннем новага мультымедыйнага сеткавага рэсурсу «От операции “Суворов” к операции “Багратион”», які быў прымеркаваны да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і прадставіў інфармацыю пра камандны склад наступальных аперацый, пра іх ход і вынікі, пра Герояў Савецкага Саюза, ураджэнцаў Віцебшчыны і Смаленшчыны, якія прымалі ўдзел у вызваленні Смаленскай і Віцебскай абласцей ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Генерацыя рэсурсу адбывалася пры інфармацыйнай падтрымцы Смаленскай абласной універсальнай навуковай бібліятэкі імя А.Т. Твардоўскага.

У 2025 годзе на камплектаванне бібліятэчнага фонду зрасходавана 295,4 тыс. рублёў бюджэтных сродкаў. У тым ліку: на набыццё бібліятэчных дакументаў (кніг, брашур, нот, выяўленчых і аўдыявізуальных дакументаў) – 114,0 тыс. руб., на перыядычныя выданні – 127,9 тыс. руб., на набыццё электронных інфармацыйных рэсурсаў і праў доступу да іх – 53,5 тыс. руб.

Усяго ў фонд бібліятэкі паступіла 8,7 тыс. экз. дакументаў. У тым ліку набыта за бюджэтныя сродкі – 7,1 тыс. экз. дакументаў. Паказчык ад агульнага бюджэту на камплектаванне склаў 12,2 %. У параўнанні з 2024 годам бібліятэчны фонд зменшыўся на 5,0 тыс. экз. Працэнт абнаўлення фонду за 2025 год склаў 1,3 %.

У мінулым годзе бібліятэка выпісвала 308 найменняў перыядычных выданняў: 255 – часопісы, 53 – газеты. Набыта 1,1 тыс. экз. сацыяльна значных выданняў на суму 24,0 тыс. рублёў бюджэтных

асігнаванняў. Кніг беларускіх выдавецтваў, у тым ліку на беларускай мове, набыта 2,1 тыс. экз. (42,1 % ад агульнай колькасці кніг, паступіўшых у бібліятэку).

Для максімальна поўнага задавальнення інфармацыйных запытаў карыстальнікаў бібліятэкі былі набыты правы доступу да ліцэнзійных электронна-бібліятэчных сістэм «Znanium.com», «Университетская библиотека онлайн», электроннай бібліятэкі «ЛитРес», работа з якімі забяспечвалася праз Віртуальную чытальную залу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Асаблівая ўвага па-ранейшаму надавалася навукова-даследчай, выдавецкай і сацыякультурнай дзейнасці. На працягу года ў бібліятэцы і па-за яе сценамі прайшло 722 масавыя мерапрыемствы, трэцяя частка якіх была праведзена на платнай аснове. Іх наведалі 22,3 тыс. чалавек, што амаль на 30 % больш, чым у мінулым годзе. Пераважная большасць сацыякультурных мерапрыемстваў (66 %) была арыентавана на карыстальнікаў-дзяцей.

Працягнулася рэалізацыя мэтавых комплексных праграм, разлічаных на 2024–2026 гг.: «Живое слово мудрости духовной», «Міласэрнасць», прававой асветы дзяцей і моладзі. Былі распрацаваны і праведзены цыклы масавых мерапрыемстваў: «Краязнаўчыя сустрэчы», «Беларусь – краіна маёй будучыні», «Правазнайка», «Літара», «Лабараторыя поспеху», «Суразмоўца» і інш. У межах праекта «Адлюстраванне» экспанавалася 14 мастацкіх выстаў, акрамя якіх 7 выстаў прадставілі вынікі дзіцячай творчасці. Працягваўся праект па арганізацыі вольнага часу чытачоў-інвалідаў па зроку «Разам!», функцыянаваў тыфлакомплекс.

Найбольш актыўная дзейнасць бібліятэкі была скіравана на прыцягненне ўвагі яе карыстальнікаў і супрацоўнікаў да сацыяльных каштоўнасцей: патрыятызму, грамадзянскаму доўгу, гістарычнай памяці, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. Большасць сацыякультурных мерапрыемстваў мінулага года была прысвечана 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, таму нагадаем найбольш значныя з іх.

19 лютага, за 80 дзён да Дня Перамогі, у бібліятэцы быў дадзены старт абласному марафону «Дарогі Перамогі», аб’яўленаму Віцебскім абласным выканаўчым камітэтам і Віцебскай абласной бібліятэкай. Прысвечаны 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, ён аб’яднаў жыхароў рэгіёна вакол паэзіі пра вайну. У асаблівай падзеі, пачатак якой паклаў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін, прынялі ўдзел чытачы і супрацоўнікі бібліятэкі, былыя малалетнія вязні канцлагераў і гета, кіраўнікі і прадстаўнікі буйных устаноў і прадпрыемстваў вобласці. Арганізатары прынялі і размясцілі на YouTube-канале бібліятэкі больш за 500 вершаў. Акрамя папулярных і малавядомых твораў прызнаных майстроў слова, у марафоне прагучалі вершы сучасных паэтаў-аматараў у аўтарскім прачытанні. Фінальнае мерапрыемства марафону «Дарогі Перамогі», на якім былі агучаны яго вынікі і прадстаўлены найбольш актыўныя ўдзельнікі, адбылося 7 мая.

Галоўным літаратурным юбілеем мінулага года стала 95-годдзе з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча, да якога бібліятэка падрыхтавала шэраг разнастайных мерапрыемстваў, што распачаліся 6 кастрычніка з літаратурнай сустрэчы «“Свет шчодры. Свет мяне паўторыць...”: Уладзімір Караткевіч на мовах народаў свету». Суарганізатарам мерапрыемства выступіў Саюз пісьменнікаў Беларусі, а яго галоўнай тэмай былі абраны пераклады паэзіі і прозы Уладзіміра Караткевіча на мовы свету.

У 2025 годзе Беларуская праваслаўная царква адзначыла шмат юбілейных дат, сярод якіх асаблівае месца заняла 900-годдзе заснавання Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра – аднаго з найважнейшых духоўных цэнтраў Беларусі. Урачыстае адкрыццё кніжнай выставы «Пяром і малітвай», прысвечанай яго шматвяковай гісторыі, адбылося 13 мая. Мерапрыемства сабрала прадстаўнікоў духавенства, вучоных, жыхароў горада і гасцей, зацікаўленых у вывучэнні багатай гісторыка-духоўнай

спадчыны рэгіёна. Пасля адкрыцця і знаёмства з выставай госці абмеркавалі актуальныя пытанні гістарычнага і культурнага значэння Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў фармаце круглага стала. Напрыканцы сустрэчы супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі ўдзельнікаў мерапрыемства з рэсурсам уласнай генерацыі «Святыя заступнікі Віцебшчыны».

У мінулым годзе бібліятэка распачала цыкл сустрэч у межах юбілейнага духоўна-асветніцкага праекта «Еўфрасіннеўскія дні», даючы чытачам шчаслівую магчымасць сустрэцца з выбітнымі прадстаўнікамі духавенства Беларускага Экзархата. Старт мерапрыемствам быў дадзены 24 верасня – у гэты дзень у бібліятэцы адбылася сустрэча-дыялог моладзі горада з прарэктарам па выхаваўчай рабоце Віцебскай духоўнай семінарыі, іерэем Дзіянісіям Андрэевым па тэме «Свабода выбару або выбар свабоды». Юбілейны цыкл працягнулі сустрэчы з кіраўніком парафіяльнага Савета храма Мікалая Японскага ў Мінску, кіраўніком камісіі Беларускай праваслаўнай царквы па сям'і, абароне мацярынства і дзяцінства протаіерэем Паўлам Сердзюком і насельнікам гомельскага Свята-Мікольскага манастыра, пісьменнікам, архімандрытам Савай (Мажука).

У мінулым годзе быў распачаты трэці сезон паказаў бібліятэчнага батлеечнага тэатра. На працягу года было дадзена 12 прадстаўленняў, гледачамі якіх сталі больш за 300 чалавек. Напярэдадні зімовых святаў бібліятэка сумесна з Віцебскім дзяржаўным каледжам культуры і мастацтваў прадставіла новы калядны спектакль «Гісторыя аднаго цуду» пры ўдзеле навучэнцаў групы спецыяльнасці «Акцёрскае мастацтва (драматычны тэатр і кіно)». На сённяшні дзень рэпертуар бібліятэчнай батлейкі складае 7 пастановак.

Па-ранейшаму, самым распаўсюджаным і самым дзейсным фарматам прасоўвання кнігі і чытання заставаліся традыцыйныя бібліятэчныя выставы. Іх агульная колькасць у мінулым годзе склала 478, з якіх 111 былі адрасаваны чытачам-дзецям. Акрамя іх супрацоўнікамі бібліятэкі былі распрацаваны 40 анлайн-выстаў, электронных прэзентацый і віртуальных аглядаў.

У мэтах павышэння інфармацыйнай культуры карыстальнікаў у 2025 годзе былі праведзены 56 аглядных экскурсій па бібліятэцы, 8 інтэрактыўных і 23 па аддзеле рэдкай кнігі і выставачнай зале «ExLibris».

Традыцыйна напрыканцы восені адбылося галоўнае навуковае мерапрыемства года – навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край». Адзінаццатая па ліку, яна была прысвечана 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і праходзіла ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна 20–21 лістапада. Акрамя бібліятэкі арганізатарамі канферэнцыі выступілі Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Віцебскі абласны краязнаўчы музей. Больш за 100 гісторыкаў, краязнаўцаў, супрацоўнікаў архіваў, музеяў, бібліятэк, вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў прынялі ўдзел у мерапрыемстве. У праграму канферэнцыі ўвайшлі прэзентацыя альбома «Маршал Баграмян», які быў выдадзены пры фінансавай падтрымцы ААТ «Мінскі гадзіннікавы завод», прэзентацыя перасоўнай выставы Смаленскай абласной універсальнай навуковай бібліятэкі імя А.Т. Твардоўскага «Край мой – гордость моя», прадстаўленай у фармаце літаратурна-музычнай кампазіцыі расійскімі калегамі, і адкрыццё выставы кніжных знакаў з калекцыі віцебскага краязнаўцы Аркадзя Падліпскага «Віцебскі экслібрыс». Па выніках канферэнцыі будзе выдадзены аднайменны зборнік дакладаў. Агульная колькасць падрыхтаваных і распаўсюджаных бібліятэкай у 2025 годзе выданняў склала 18 найменняў.

Установа арыентавана на развіццё міжнароднага супрацоўніцтва з бібліятэкамі далёкага і блізкага замежжа, пераважна Расійскай Федэрацыі, з якімі падпісана 11 пагадненняў. У поўнай меры былі

рэалізаваны планы сумесных мерапрыемстваў па патрыятычным выхаванні на 2024–2025 гады з Пскоўскай і Смоленскай абласнымі ўніверсальнымі навуковымі бібліятэкамі.

З першай з іх у рамках адзначанага плана былі арганізаваны круглы стол «Адна зямля – адна гісторыя», міжнародныя сеткавыя акцыі «Листая страницы войны» і «Сямейныя гісторыі пра вайну», анлайн-марафон «80 радкоў пра вайну».

Сумесны праект «Віцебск – Смаленск: патрыятычны дыялог» аб'яднаў 22 красавіка ў Смаленскай абласной універсальнай навуковай бібліятэцы імя А.Т. Твардоўскага прадстаўнікоў Віцебскай абласной бібліятэкі, Аршанскай і Лёзненскай цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм, Смаленскай абласной бібліятэкі для дзяцей і моладзі імя І.С. Сакалова-Мікітова, Сафонаўскай раённай ЦБС і Ярцаўскай цэнтральнай бібліятэкі. У круглым стале «Сучасная бібліятэка як рэсурс патрыятычнага выхавання» беларускія і расійскія бібліятэкары падзяліліся вопытам па рэалізацыі патрыятычных праектаў, абмеркавалі пытанні краязнаўчай работы як адной з форм выхавання грамадзянскасці, разгледзелі напрамкі інфармацыйна-выдавецкай дзейнасці бібліятэк як значнага кампанента ў патрыятычным выхаванні чытачоў.

Таксама па прапанове смаленскіх калег буйнейшая публічная бібліятэка Віцебскага рэгіёна ўвайшла ў склад суарганізатараў Міжнароднага фестывалю-конкурсу чытальнікаў «Адзінай памяці верныя», што быў праведзены ў рамках штогадовай акцыі «Ляці, радок!».

У 2025 годзе ў бібліятэцы працаваў 81 бібліятэчны работнік. З 46 супрацоўнікаў аддзелаў абслугоўвання 38 бібліятэчных кіраўнікоў і спецыялістаў былі заняты непасрэдна абслугоўваннем чытачоў. Нагрузка на аднаго бібліятэкара склала ў сярэднім па карыстальніках – 993 чалавекі (пры норме 800), па дакументавыдачы – 19058 (пры норме 10000).

У мінулым годзе па-ранейшаму перад бібліятэкай стаяла задача павелічэння долі пазабюджэтных сродкаў у яе фінансаванні. Аб'ём выкананых платных паслуг склаў 41,7 тыс. руб., тым самым перавысіўшы паказчык папярэдняга справаздачнага перыяду на 14,0 тыс. руб. Трэці год запар паспяхова рэалізоўваліся праекты па прыцягненні замежнай бязвыплатнай дапамогі.

У 2025 годзе па большасці асноўных паказчыкаў бібліятэка дасягнула значных вынікаў, што было пакладзена ў аснову планавання работы ўстановы на 2026 год.